**Мядзіль, А.** Валянціна Багатырова – «Чалавек года Віцебшчыны–2021» / падрыхт. А. Мядзіль // Мы і час (Віцебск). – 2022. – 29 сак. – С. 3.

**Валянціна Багатырова – «Чалавек года Віцебшчыны–2021»**



Прэмію штогадовага конкурсу Віцебскага аблвыканкама атрымалі 50 прадстаунікоў розных прафесій. Гэта аграрыі, інжынеры, прамыслоўцы, сацыяльныя работнікі, фінансісты, урачы, настаўнікі, студэнты, спартсмены.

Рэктар нашага ўніверсітэта, доктар эканамічных навук, прафесар Валянціна Багатырова стала лаўрэатам рэгіянальнай прэміі «Чалавек года Віцебшчыны-2021» у намінацыі «Сацыяльная сфера (сацыяльная абарона насельніцтва, культура, адукацыя, навука, спорт, ахова здароўя, моладзь)».

Дзякуючы кіраўнічым рашэнням Валянціны Васільеўны забяспечаны істотны прырост пазабюджэтных рэсурсаў: у 2020-м і 2021-м гадах аб'ём перавысіў 2018-ы і 2019-ы ў 2,5 разы. Гэта стварыла фінансавую магчымасць для павелічэння больш як у шэсць разоў укладанняў у абнаўленне матэрыяльна-тэхнічнага абсталявання. У мінулым годзе ВДУ стаў уладальнікам Гран-пры Міжнароднай бізнес-прэміі «Лідэр года», атрымаў прэмію Урада за дасягненне значных вынікаў у галіне якасці, у ліку васьмі вну Беларусі ўвайшоў у рэйтынг лепшых устаноў адукацыі краін Еўропы і Сярэдняй Азіі.

«Добрасумленная праца і мэтанакіраванасць нашых людзей адкрываюць новыя гарызонты і ўмацоўваюць імідж усёй вобласці. Вынікі, якіх вы здолелі дабіцца, маюць асаблівую каштоўнасць для нашага рэгіёну. Сваёй дзейнасцю вы даказваеце, як многа можа зрабіць чалавек, які рухаецца жаданнем бачыць свой край яшчэ больш моцным і прыгожым. Гэтая ўзнагарода – не імгненны трыумф, а аўтарытэт, які каваўся гадамі, а таксама прафееіяналізм, упартасць, прагрэсіўныя падыходы. Безумоўна, усе сферы важныя. І сёння мы адзначаем і тых людзей, якія вырошчваюць хлеб, і тых, якія даюць адукацыю, і тых, якія лечаць, асабліва ў апошнія гады, Яны з любоўю і вялікай самааддачай проста выконваюць сваю справу», – адзначыў старшыня Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта Аляксандр Субоцін.

Ганаровае званне «Чалавек года Віцебшчыны» у Віцебскай вобласці прысвойваецца з 2009 года з мэтай заахвочвання людзей за заслугі ў садзейнічанні правядзенню і рэалізацыі сацыяльнай і эканамічнай палітыкі дзяржавы і органаў мясцовага кіравання, ажыццяўленню мер па забеспячэнні законнасці і прэвапарадку, за дасягненні ў галіне навукі, адукацыі і культуры, актыўную грамадскую дзейнасць.

Валянціна Васільеўна ўпэўнена, што, калі ўзнагароджваюць кіраўніка – узнагароджваюць увесь калектыў.

«Адзін у полі не воін. Усе дасягненні ўніверсітэта – гэта праца вялікай каманды. Мы дружныя, згуртаваныя, глядзім у адным кірунку, а значыць эдолеем ажыццявіць усе нашы мары», – адзначыла Валянціна Багатырова.

**P.S** Калектыў ВДУ імя П.М. Машэрава ад усёй душы віншуе Валянціну Васільеўну з заслужанай узнагародай і жадае новых ідэй, смелых рашэнняў на карысць нашага ўніверсітэта, Віцебскага рэгіёну і Рэспублікі Беларусь!

**Алеся Мядзіль.**